# Мая Радзіма — Беларусь

Валіеў Міхаіл,

дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа №125 горада Мінска",

6 "В" клас

Сядайце, сябры , ды слухайце.

Жыла-была дзяўчынка. Яе звалі Беларусь. Прыгажуня! Залатыя пшанічныя косы, блакітныя вочы-азёры, малінавыя вусны. І была яна не адна. Разам з ёй пражывалі амаль 9 мільёнаў чалавек. Яны жылі дружна і мірна. Людзі вельмі клапаціліся пра Беларусь і стараліся зрабіць яе чыстай і прыгожай. За гэта дзяўчына ім дзякавала, давала свежае паветра, чыстую ваду, цёплае сонейка.

Было ў Беларусі пяць суседак: Расія, Украіна,Польша, Літва і Латвія. Ні з кім не сварылася Беларусь, усіх запрашала да сябе ў госці. Расія была лепшай сяброўкай для Беларусі. Шмат часу праводзілі яны разам. Разам смяяліся, разам сумавалі.

Беларусь была вольналюбівай дзяўчынай і вельмі любіла прасторныя лугі і лясы. А вольны час яна праводзіла на сваіх шматлікіх азёрах і рэчках, залацістых палях і ціхіх балотах.

Беларусь- клапатлівая гаспадыня, працавітая. Усё ў яе чыстае, дагледжанае. Поўныя амбары ячменю, жыта, пшаніцы, проса. Але асабліва любіла Беларусь бульбу. Якія смачныя стравы з яе гатавала Беларусь: румяныя дранікі, духмяную бабку, сочныя клёцкі!

У нашай Беларусі шасцёра дзяцей: Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Мінск і Магіелёў. Дзень нараджэння Брэста — 1019 год. Віцебск нарадзіўся ў 1021 годзе. Гомель у першы раз убачыў свет у 1142 годзе. Гродна з'явілася на свет у 1128 годзе. А ў Мінска дзень нараджэння 3 сакавіка 1067 года. А Магілеў з'явіўся ў 1267 годзе. Прыгожыя дзеці ў Беларусі! Растуць, развіваюцца дзень за днём.

Таксама трэба вам нагадаць пра гісторыю нашай дарагой Беларусі. Адкуль з'явілася дзяўчына? Даўным-даўно людзей, якія пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, Расіі і Украіны звалі славянамі. А яшчэ раней на тэрыторыі сучаснай Беларусі жылі плямёны балтаў, якія аб'ядналіся са славянамі. Сабралі яны ўсе свае лепшыя рысы: разважлівасць, розум, працавітасць, сілу, няспешнасць, рашучасць – і ўтварылі маленькую дзяўчынку, якая расла, сталела і стала насіць прыгожае імя –Беларусь. Так і з'явілася на свет наша гераіня.

Шмат чаго перажыла яна, шмат чаго бачыла. Не заўсёды шчасліва складаўся лёс дзяўчыны. Асабліва страшны той момант, калі Беларусь магла загінуць…

Гэта было 22 чэрвеня 1941 года ў 4 гадзіны раніцы. Быў на першы погляд звычайны дзень. Але ў гэты час, калі ўсе спалі, на Беларусь напалі фашысцка-нямецкія захопнікі. Калі дзяўчына прачнулася, пачалося самае страшнае. Гулы, стрэлы, выбухі… Усе салдаты і Беларусь стаялі, як маглі. Столькі нявінных душ тады загінула…

У гэты час страшнай вайны была адна вёска — Хатынь. 22 сакавіка 1943 года фашысты спалілі  Хатынь з усімі мірнымі жыхарамі. Гэта трагедыя ўвайшла ў гісторыю Беларусі назаўседы. Шрамам лягла мёртвая вёска на целе Беларусі. Ды колькі такіх шрамаў засталося  з таго страшнага часу… Яны зараз як напамін сучасным жыхарам пра неабходнасць цаніць мір, берагчы Беларусь.

Вялікая Айчынная вайна працягвалася з 1941 па 1945 год. Чатыры гады нясцерпнага болю… У нашы дні лічаць, што загінуў кожны трэці жыхар Беларусі. Тады  дзяўчына сапраўды  была ў кроку ад смерці.

Прайшлі гады, і зараз Беларусь –гэта сучасная краіна. Яна развівае тэхналогіі, робіць даследванні, адпраўляе сваіх жыхароў у космас. Але яна ўсё тая ж дзяўчына, з пшанічнымі косамі і лагоднай усмешкай. Яна шчыра вітае сваіх гасцей, заўсёды гатова прыйсці на дапамогу.

Вось такая, сябры, казка-быль. Казка-быль пра маю любімую краіну, дзе жыву я, мая сям’я, мае сябры.  Я хачу, каб над маёй краінай было толькі мірнае неба, каб Беларусь з кожным годам толькі квітнела. А гэта залежыць ад нас з вамі. Давайце разам рабіць нашу краіну лепшай!